■ Прыгожая анамалія

# Палярнае ззянне даляцела і да сталіцы

## На Віцебшчыне гэту з'яву цяпер можна ўбачыць 2—3 разы на год

**Гэтымі днямі магутны паток сонечных часціц абрынуўся на Зямлю, што выклікала моцную магнітную буру. Гэта, у сваю чаргу, азначае, што ўвечары і ўначы на поўначы краіны можна было назіраць найпрыгажэйшае палярнае ззянне.**



У мінулыя суткі ў нас адзначаліся ідэальныя сінаптычныя ўмовы для назірання гэтай прыроднай з'явы. Адсутнасць аблокаў і яснае неба — выдатная магчымасць паназіраць за палярным ззяннем. Напрыклад, уначы з 13 на 14 кастрычніка неба на некалькі гадзін афарбавалася рознакаляровымі выбліскамі. Больш за тое, аказалася, што ўспышкі былі такімі моцнымі, што іх змаглі ўбачыць нават жыхары Мінскага рэгіёна. Таксама рознакаляровае неба было відаць у іншых краінах — у Расіі, Літве і Нарвегіі. Калі ўначы ў нас ізноў будзе чыстае неба, то водбліскі гэтай з'явы жыхары Віцебскай вобласці змогуць убачыць і на выхадныя.

У любым выпадку, верагоднасць убачыць успышкі павялічваецца па меры набліжэння да поўначы Беларусі.

Навукоўцы заяўляюць, што палярнае ззянне не ўяўляе нейкай пагрозы для чалавека з нармальнай псіхікай. Гэтая з'ява сталася вынікам сонечнай актыўнасці, паведамляюць спецыялісты Інстытута фізікі НАН Беларусі.

Успышкі на Сонцы актывізаваліся, што і стала прычынай ззяння, або сонечнага ветру. Паводле слоў навукоўцаў, гэтая з'ява не заўсёды бывае пры сонечнай актыўнасці, а толькі ў тым выпадку, калі выкід сонечнай энергіі накіраваны ў бок Зямлі. У інстытуце адзначылі, што ніякай небяспекі для людзей палярнае ззянне не нясе. Выключэнні могуць складаць людзі з «тонкай» псіхікай, якія абвострана рэагуюць на любыя прыродныя з'явы. Яны таксама адзначылі, што на самай справе палярнае ззянне не такая ўжо і рэдкая для Беларусі з'ява. Слабае палярнае ззянне, напрыклад, у паўночнай частцы Віцебскай вобласці, калі прыглядзецца, можна ўбачыць 2—3 разы на год, запэўніваюць фізікі. Навукоўцы раскрылі сакрэт, як загадзя даведацца аб гэтым. Паводле іх слоў, на спецыялізаваных сайтах ёсць інфармацыя аб будучых магнітных бурах. Лепш арыентавацца на моцную магнітную буру і на сонечныя ўспышкі, якія накіраваны ў бок Зямлі. А яшчэ трэба прасіць у сіноптыкаў «чыстага» неба.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.38 | 18.12 | 10.34 |
| Віцебск — | 7.30 | 17.59 | 10.29 |
| Магілёў — | 7.28 | 18.02 | 10.34 |
| Гомель — | 7.22 | 18.01 | 10.39 |
| Гродна — | 7.53 | 18.27 | 10.34 |
| Брэст — | 7.51 | 18.30 | 10.39 |

### Месяц

*Першая квадра 09.10—15.10. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Ганны, Усціны, Андрэя, Давыда, Канстанціна.*
*К. Тэрэзы, Ядвігі, Леанарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова



Яшчэ імгненне —
і ў палёт!
Ліст паляцінь
у край раздольны
Далей ад восені
няўмольнай,
Прэч ад завеі,
ад нягод...

Але мінаюць летуценні,
І ліст заложнікам быцца
Ляжыць на прыступках
асенніх
Бясконцай лесвіцы
жыцця.

А плынь ізноў у далеч
вабіць,
І ўсё паўторыцца ізноў...
Заўжды лістота будзе
марыць
Ляцець да новых
берагоў.



Даты | Падзеі | Людзі

### 15 КАСТРЫЧНІКА

**1844** год — нарадзіўся Фрыдрых Ніцшэ, нямецкі філосаф, прадстаўнік ірацыяналізму. Ніцшэ рэзка крытыкаваў рэлігію, культуру і мараль свайго часу і распрацаваў уласную этычную тэорыю. Ён быў хутчэй літаратурным, чым акадэмічным філосафам, і яго творы носяць афарыстычны характар.

**1917** год — у Францыі па абвінавачанні ў шпіянажы пакарана смерцю Мата Хары. Яна была добра вядомая ў Еўропе ў пачатку ХХ стагоддзя як прафесійны выканаўца індыйскіх і японскіх танцаў. Выдаючы сябе за дачку храмавай танцоркі з Ост-Індыі, яна выступала ў модных салонах Парыжа, Монтэ-Карла, Берліна, Вены, Мілана і Мадрыда. Карыстаючыся велізарным поспехам, Мата Хары лічылася самай высокааплатнай куртызанкай у Еўропе. Але сусветна вядомым яе імя стала з-за іншага таленту: самая прыгожая жанчына Парыжа зачароўвала мужчын, высокапастаўленых чыноўнікаў і ваенных, і, карыстаючыся момантам, выведвала ў іх дзяржаўныя таямніцы. Менавіта гэта і прывяло яе да сумнага выніку.

**1926** год — нарадзіўся (в. Скарабагатаўшчына Дзяржынскага раёна) Леанід Іосіфавіч Мінько, беларускі этнограф, кандыдат гістарычных навук. Даследчык побыту, духоўнай культуры, каляндарных свят, магічных абрадаў беларусаў. Аўтар кніг «Народная медыцына Беларусі», «Знахарства», «Забабоны і прыкметы» і інш.

**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся (г. Гомель) Леанід Рыгоравіч Гейштар, савецкі канаіст, алімпійскі чэмпіён 1960 года, чэмпіён свету. Заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер, заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Беларусі.



**1936** год — 80 гадоў з дня нараджэння (вёска Слабада Лагойскага раёна) Міколы Гіля (сапр. Мікалай Сямёнавіч Гілевіч), беларускага пісьменніка і публіцыста, журналіста, перакладчыка. Член Саюза пісьменнікаў СССР. Працаваў рэдактарам перадач для дзяцей на Мінскай студыі тэлебачання, у часопісах «Родная прырода» і «Маладосць». Большая частка працоўнай біяграфіі звязана з газетай «Літаратура і мастацтва» (у 1990—1997 гадах галоўны рэдактар выдання). У 2004—2008 гадах — галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва». Аўтар шэрагу кніг. Перакладаў на беларускую мову творы літоўскіх, венгерскіх і шведскіх пісьменнікаў.

### Было сказана

**Аляксей ПЫСІН, паэт:**

*Не быць у чэрствасці ў палоне*
*І даражыць на ўсе часы*
*І крошкай хлеба на далоні,*
*І нават кропляю расы.*

## УСМІХНЕМСЯ

**«Гараскопы састарэлі з-за змены становішча зорак», — сцвярджае амерыканскае аэракасмічнае агенцтва NASA. Над мільёнамі жаночых лёсаў навісла страшная пагроза.**

— Тры гадзіны ночы! Хто вы?!
— Гэта тата вашага вучня, Алена Васільеўна! Спіце?
— Вядома!
— А мы каштаны пілуем, жалуды пратыкаем — рыхтуем вырабы на конкурс «Бывай, восень»!

**Ляжаш проста паляжаць — заснеш. Ляжаш пачытаць — заснеш. Ляжаш тэлевізар паглядзець — заснеш. Ляжаш спаць — чорта з два заснеш!**

Сын прыходзіць дадому з двойкай.
— Тата, толькі не хвалюйся!
— Добра, толькі не крыўдуй!

**Рэгулярна ўжываю часнок і лук, таму пра ангіну ведаю толькі па чутках. Пра секс, праўда, таксама...**




Малюнак Аляксандра ПЯТРОВА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4083.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2016 года.